View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Тэма ГУЛАГа ў дзённікавай прозе: адметнасць экзістэнцыяльнага мыслення

Цікавасць да экзістэнцыяльных аспектаў "лагернай" аўтабіяграфічнай прозы сведчыць аб іх невычэрпнасці, жаданні мастакоў "перапрачытаць вечнасць" праз прызму ўласных светапоглядных канцэпцый і аб неабходнасці іх актуалізацыі ў новых гістарычных умовах. Аўтар артыкула не ставіць перад сабой задачу ахапіць усю аўтабіяграфічную прозу з "лагернай" тэматыкай, яна можа стаць прадметам самастойнага навуковага пошуку. Мэта нашых разважанняў — на прыкладзе некаторых твораў (Ф.Аляхновіч "У капцюрох ГПУ", Л.Геніюш "Споведзь", С.Грахоўскі "Зона маўчання", "З воўчым білетам", "Такія сінія снягі", Б.Мікуліч "Аповесць для сябе", А.Ват "Мой век. Вусныя мемуары") паказаць высокі энергетычны патэнцыял экзістэнцыяльных праблем у сітуацыі парога, мяжы і ступень іх мастацкага ўздзеяння на чытача.

Гулагаўская тэматыка аўтабіяграфічнай прозы даследуе быццё паміж жыццём і смерцю, дэфармаваную свядомасць у замкнёнай прасторы, страчаную цэласнасць асобы, няспраўджаны ідэал. Прыватныя аўтабіяграфічныя факты знаходзяць у тэкстах такую ступень мастацкага абагульнення, якая надае ім эстэтычную цэласнасць, скіраваную на тое, каб зразумець логіку жыцця ў нечалавечых умовах, асэнсаваць анталагічныя праблемы быцця. Паглыблены самааналіз духоўнай сферы ў лагерных абставінах выкліканы пакутлівым усведамленнем зменлівага і супярэчлівага жыцця душы ў пошуках ісціны ва ўмовах знешняй рэчаіснасці з яе нестабільнасцю, цякучасцю, хуткаплыннасцю.

Пры захаванні гісторыка-падзейнай асновы твораў пісьменнікаў-вязняў сталінскіх лагераў Ф.Аляхновіча ("У капцюрох ГПУ"), Л.Геніюш ("Споведзь"), С.Грахоўскага ("Зона маўчання", "З воўчым білетам", "Такія сінія снягі"), Б.Мікуліча ("Аповесць для сябе") філасофскі падмурак працэсу аб’ектывацыі чалавека ў зняволенні становіцца асноватворным. Жыццё ссыльных перастае быць толькі іх прыватным выпадкам, яно набывае анталагічныя параметры, пры якіх "эгоизм мирового устройства, все обрекающего на смерть, уравновешен эгоизмом жизни, отторгающей от себя смерть" [1, с. 211]. Тэма смерці ў "лагернай" прозе хвалюе сваёй усеагульнасцю, і ў той жа час сітуацыя смерці анталагічная і экзістэнцыяльная, бо "каждая человеческая личность представляет собой нечто уникальное, каждая жизненная ситуация возникает лишь однажды" [2, с. 171-172].

Грахоўскі-мастак не паказвае саму сітуацыю смерці, не фіксуе эпіцэнтр смерці, а толькі яе матывацыю і вынік. Чым кіруецца пісьменнік у такім выбары? Па-першае, канвеер смерці ў сталінскіх лагерах працаваў настолькі няспынна, што апісваць смерць як сітуацыю С.Грахоўскі лічыў, відаць, бесчалавечным актам. Па-другое, адносіны да смерці ў маладым узросце не адпавядалі ўспрыманню факта смерці сталым чалавекам, калі пісаліся ўспаміны. Лагерныя ўмовы існавання і штодзённае бачанне смерці няўмольна ставілі пытанне: ці варта такое жыццё таго, каб хацець жыць? ("Рызыка. Чым я,

уласна кажучы, рызыкую? Жыццём? Але навошта яно, каму трэба? Не сёння дык заўтра загнешся" [3, с. 100].)

Кнігі ўспамінаў С.Грахоўскага ("Зона маўчання", "З воўчым білетам", "Такія сінія снягі") напоўнены метафізічным смуткам аб перарваных сувязях з роднымі, аб нерэалізаваных жыццёвых марах, аб загубленым часе: "<...> за што на мне паставілі агіднае кляймо недаверу, падазронасці, чаму я не ўпэўнены не толькі ў заўтрашнім дні, а ў наступнай хвіліне, чаму не дае спакою прадчуванне, што не ўся бяда мінавала, што нехта страшны цікуе мой кожны крок <...>" [3, с. 224]. Невыпадкова ў аповесцях "З воўчым білетам" і "Такія сінія снягі" пісьменнік у роспачы прызнаецца, што хацеў бы вярнуцца ў лагерную рэальнасць, каб толькі не адчуваць маральнага прыніжэння, якое было больш пакутлівым за смерць. ("Божа мой, хацелася стагнаць і раўсці ад знявагі, абразы і болю, ад сораму, што стаяў, як вінаваты школьнік, перад гэтым сыценькім і ружовенькім, упэўненым у сваёй неабмежаванай уладзе малодшым лейтэнанцікам" [3, с. 328]; "Часам адчуваў, што з малой зоны перавялі ў большую, але там ты быў роўны з усімі, а тут — адрынуты ізгой"[3, с. 211].) С.Грахоўскі дакладна фіксуе дыялектыку разбурэння душы пад прыгнётам страху, які зацыклівае свядомасць, замыкае псіхіку і выклікае варожае стаўленне чалавека да свету наогул.

Для Л.Геніюш у "Споведзі" настрой метафізічнага страху, унутранай замкнёнасці не ўласцівы, яе выратоўвала вера ў Бога ("<…> я моцна веру ў Бога й толькі гэтай дарогаю магу йсьці й шукаць нейкай праўды, ратунку для маяго народу" [4, с. 10]). І тым не менш перакананасць, што межы чалавечнага і сама чалавечнасць парушаны адсутнасцю ў грамадстве веры ў Бога і д'ябла, выразна гучыць на старонках "Споведзі": свет без Бога, на думку паэтэсы, страціў маральныя арыенціры і пакаціўся ў бездань. Гераіня ўспамінаў, па яе ўласным прызнанні, жыве ў свеце вар'яцкім, і бязбожным адначасова. Сваю задачу Л.Геніюш бачыць у тым, каб стрымаць націск вар'яцтва-бязбожнасці на сябе і на свет. Лёс жанчыны-вязня тоесны лёсу мільёнаў людзей, якія сталі ахвярамі пануючага ў межах краіны і Еўропы вар'яцтва, і толькі рух пачуццяў ад адчаю, страху да філасофскага разумення сваіх выпрабаванняў, да ўсведамлення неперможнасці Духу і Святла надае пісьменніцкаму "я" ў "Споведзі" жыццесцвярджальную аптымістычную трываласць.

Моцны духоўны стрыжань выратоўвае "я" гераіні, у гармоніі душы і духу Л.Геніюш знаходзіць сілы для процістаяння хаосу. Невыпадкова яе вершы станавіліся выратавальнай "глюкозай" для вязняў, бо яны гарманізавалі свет. "Нельзя сопротивляться могуществу гармонии, внесенной в мир поэтом…", — пісаў А.Блок [5, с. 347]. На старонках аўтабіяграфічнай кнігі гучыць непрыхаванае адчуванне ўласнай прарочай місіі на зямлі, сваёй абранасці, адзінкавасці, якія засталіся недаацэненымі пры жыцці. "Споведзь", улічваючы ўмовы пасляваеннай творчай ізаляцыі Л.Геніюш, выконвае для аўтара яшчэ і псіхатэрапеўтычную функцыю, бо мастак, аналізуючы крытычныя сітуацыі свайго жыцця і вырашаючы яго супярэчнасці ў свядомасці, набывае тым самым уласную душэўную раўнавагу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Чалавек у лагеры, апынуўшыся сам-насам з бязладдзем, сапраўды трапляе ў экзістэнцыяльную сітуацыю, калі, па словах Сартра, няма на што абаперціся ні ў сабе, ні ў знешнім свеце, калі полюсы дабра і зла, жыцця і смерці сышліся разам, і свет увяз у вар'яцтве, а само жыццё ператварылася ў бясконцыя пакуты. "Лагерная" аўтабіяграфічная літаратура надзвычай востра актуалізавала праблему: дзе ў чалавеку мяжа д'ябальскае — чалавечае, які пачатак дамінуючы — чалавечы альбо д'ябальскі? Для пісьменнікаў-вязняў у сітуацыі "ні жыццё, ні смерць" каштоўны любы вопыт, нават самы пачварны. Сустрэча дзвюх іпастасей у душы і псіхіцы асобы ў экстрэмальных умовах дае магчымасць мастакам выявіць псіхалагічныя першаасновы чалавека, яго экзістэнцыяльную сутнасць: жыццё, нават бессэнсоўнае, паламанае, пакамечанае, мае сваю каштоўнасць.

Экзістэнцыяльнае сутыкненне дабра і зла, жыцця і смерці ва ўмовах лагера зафіксавала адсутнасць усялякіх межаў і штурхнула чалавека ў метафізічную пастку, дзе ён канчаткова згубіў кропку адліку ў ацэнцы любых катэгорый. Спрадвечныя філасофскія праблемы (дзе праходзіць мяжа паміж быццём і нябытам, што ёсць смерць духоўная і фізічная, у чым сэнс зямнога жыцця, паламанага і зруйнаванага, чаму адзін чалавек інтуітыўна адчувае межы, а ў другім пераважае інстынкт бязмежнасці) паўсталі з новай сілай. "Дзе ж тая праўда? Ці была яна, ці ёсць?"— пытаецца С.Грахоўскі [3, с. 6]. Стан спустошанасці, абыякавасці, аморфнай свядомасці, сітуацыя, калі "няма на што абаперціся", калі "праўдаю лічаць хлусню, фантазію і самапаклёп" [3, с.17], а "душа абрастае брудам" [3, с. 98], сталі аб'ектам мастацкага даследавання ссыльных пісьменнікаў.

С.Грахоўскі праблемы светабудовы, яе маральных арыенціраў звязвае перш за ўсё з прыроднай мэтазгоднасцю чалавечага існавання: "У самай страшнай бядзе толькі чалавек ратуе чалавека, толькі дабро і спагада вядуць з цемры безнадзейнасці да жыцця і збавення" [3, с. 4], "Без веры нельга жыць. Верылі і мы ў лепшае, таму і выжылі" [3, с. 281]. Наогул, праблема быцця непарыўна звязана з праблемай зла, якое асацыіруецца не толькі са злом сацыяльным, але і метафізічным, калі жыццём чалавека кіруе злая воля, дэманічныя сілы, асэнсаваць і супрацьстаяць якім немагчыма. "Лагерь в его становлении, проявлении и исчезновении, — сведчыць вядомы псіхолаг В.Франкл, які спецыяльна займаўся праблемай чалавека ў лагерных умовах, — содержит в себе, как в образце, в концентрированном виде всю сумму зла и страданий, которые во всех других местах существуют более распыленно и менее зримо, однако действуют столь же нешуточно. Ведь особенность лагеря состоит в том, что все ложное, опасное, глупое и низкое, что произрастает в человеке и человеческих институтах, смело выступает здесь в своей зловещей и неумолимой обнаженности. Здесь мы видим перед собой дьявольскую карикатуру на в принципе возможную, может быть, даже реально существующую систему управления, недостойное человека существование в псевдоколлективном омассовлении, в кабале или в рабстве" [2, с. 154-155].

Што ламала-калечыла многіх людзей у лагеры? Адкуль узнікала метафізічная безнадзейнасць? Прычыны дэфармацыі асобы пісьменнікі-вязні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бачаць у поўнай адсутнасці перспектывы на годнае чалавечае жыццё. Такая татальная безвыходнасць асабліва была страшнай для людзей творчых, думаючых, бо мадэллю іх жыцця ў зоне быў " жах унутранага спусташэння" (В.Франкл). Не кожнаму ссыльнаму дадзена было ўсвядоміць агульную неспрыяльнасць гістарычнага часу эпохі, але гэта стала адзінай умовай не звар’яцець, захаваць рысы чалавечнасці і выжыць. Пісьменнікі-вязні былі сведкамі таго, як замкнёная прастора турэмнай зоны ператварала рэчаіснасць у фантом, і самі зняволеныя, апынуўшыся на парозе жыцця і смерці, выглядалі фантомна. Жыццё па-за зонай здавалася лагернікам чужым і недасягальным, уласнае быццё яны перажывалі экзістэнцыяльна. Іх хворая свядомасць фарміравала сюррэалістычную карціну рэчаіснасці: манію праследавання, адсутнасць здаровага сэнсу, трансцэндэнтнае адчуванне Пустаты. І толькі арыентацыя на інтуіцыю, прыродную кемлівасць часам ратавала асобных людзей ад гібелі.

Выявіць мяжу дабра і зла ў самім чалавеку, вызначыць, што ёсць сумленне — нялёгкая задача "лагернай" прозы. Л.Геніюш піша: "<…> на чалавечае сумленьне цаны няма! Такое не прадаецца, і няхай мне ніхто ня кажа, што нельга ўстояць!!! Няма сумленьня й няма чалавека! Касьцяк людзкі — гэта людзкое сумленьне" [4, с. 127]. В.Франкл сцвярджае: "<…> концлагерь был не чем иным, как микрокосмическим отражением мира людей вообще. Жизнь в концлагере раскрыла самые бездонные глубины человеческой души. Должно ли нас удивлять, что в этих глубинах вновь обнаружилось все человеческое? Человеческое, как оно есть, — как сплав добра и зла! Трещина, которая проходит через всю человеческую природу, разделяя добро и зло, достигает и этих, самых глубоких, глубин и отчетливо видна как раз на фоне той бездны, которую представляет собой концлагерь" [2, с. 154]. Узнятая пісьменнікамі тэма "лагера" актуалізавала праблему страты ўласнай суб’ектыўнасці (дэперсаналізацыю), якая выклікала пагрозу быць нівеліраваным іншымі, што непазбежна прыводзіць чалавека да самаізаляцыі, калі знешні свет перастае для яго існаваць і фактычна ствараецца "мікракосмас у самім сабе" (Лэйнг). Такім чынам, становіцца рэальнай пагроза збяднення ўнутранага свету, не здольнага да ўзбагачэння праз знешні свет. І чалавек як асоба гіне.

У аўтабіяграфічным творы Л.Геніюш дамінуе ўласцівы жанчыне пачуццёвы бок перажывання падзей, але гэта не зніжае каштоўнасцей аўтарскага бачання свету. Вобраз аўтара-паэткі ў "Споведзі" засноўваецца перш за ўсё на фундаменце ўласнага разумення служэння Айчыне, што і вызначае вагу і значнасць пісьменніцкага "я". Аднак тут важна ўлічваць і тое, што запісы рабіліся ў другой палавіне жыцця, калі чалавек падсумоўвае жыццёвыя вынікі і карэкціруе свой ідэал з рэальным гістарычным часам. Таму ў кнізе шмат надаецца ўвагі тлумачэнню асабістага светапогляду, асэнсаванню прыватных пралікаў, памылак, агрэхаў.

Успаміны Л.Геніюш — гэта жаданне ўпарадкаваць перш за ўсё ўласны ўнутраны свет, ураўнаважыць маральныя, інтэлектуальныя, творчыя складнікі свайго характару, набыць гармонію ў душы. Пачуццё сацыяльнай незапатрабаванасці ў час напісання ўспамінаў прымушае пісьменніцу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эмацыянальна глыбока перажываць падзеі мінулага. Спроба ўраўнаваць жорсткі знешні свет і крохкі, чулы ўнутраны падштурхоўвае Л.Геніюш стаць на пазіцыю філосафа-стоіка, вызначальным фактарам якой застаецца высокі маральны ідэал: бескарыслівасць, пачуццё доўгу, жаданне дапамагчы блізкаму. ("Застыць, аднак, у горы мне было і нельга, і непатрэбна. Патрэбна было думаць і жыць і памагаць думаць другім" [4, с.255-256].)

Каштоўнасць любога аўтабіяграфічнага твора не толькі і не столькі ў апісанні падзей, сведкам якіх быў мастак, а ў тым, як яго індывідуальная свядомасць асэнсоўвае іх і бачыць сябе ў іх. Менавіта аўтарская суб’ектыўная думка вызначае: апавядаць толькі пра факты, якія сам аўтар бачыў, ці "реконструировать внутреннее состояние действующих лиц, мотивы, которые руководили их действиями, но не были доступны внешнему наблюдению…" [6, с. 138]. На першым плане ў творах С.Грахоўскага, Л.Геніюш, Б.Мікуліча не пералік падзей, а адчуванні аўтараў, якія самі пражываюць гэтыя падзеі і здольныя зазірнуць у душы тых, хто побач. Нават сямейна-бытавая тэматыка падаецца ў творах не на ўзроўні апісальнасці, яна цесна пераплецена з паглыбленым псіхалагічным аналізам душэўных перажыванняў усіх дзеючых асоб. "У лагеры кожны адкрываецца, само жыццё паказвае нутро чалавека, тут чалавек — адкрытая кніжка, адзін другога чытае наскрозь", — піша Л.Геніюш [4, с. 212]. У тэкстах ссыльных пісьменнікаў не адбываецца абытаўлення зместу, прыярытэтным застаецца маральна-псіхалагічны аналіз, і нават дробная лакальная з’ява здольна набыць агульназначны сэнс.

Запісы Ф.Аляхновіча ("У капцюрох ГПУ") носяць характар хронікі-запавету для нашчадкаў. Пісьменнік усведамляе гістарычную значнасць сваіх успамінаў, таму кніга вытрымана пераважна ў рамках інфармацыйна-аналітычнага пісьма, мэта якога — інфармаваць свет аб масавых небяспечных эксперыментах бальшавікоў над людзьмі. Перавага ў творы Аляхновіча надаецца фактам турэмнага зняволення, будзёнаму жыццю вязняў, але гэта не выклікае пачуцця раздробленасці свету, адсутнасці лагічнай сувязі паміж асобнымі падзеямі, хоць твор складаецца з эпізодаў, якія маюць прыкметы завершаных апавяданняў-мініяцюр. Рэдкія лірычныя адступленні таксама ўплецены ў панараму грамадскага, сацыяльнага жыцця. "Адарвалі мяне ад жыцьця назаўсёды. Калі вытрываю ўсе 10 гадоў "прынудработ" у Салавецкім лагеры, пашлюць мяне на пасяленьне недзе ў Пячорскую тундру ці ў Нарымскі край... Калі там не памру з голаду, цынгі, тыфусу або калі мяне зноў не арыштуюць, мне будзе дазволена зьмяніць месца — пераехаць кудысьці ў край зь мякчэйшым кліматам, — але на бацькаўшчыну, на Беларусь, ужо не дазволяць вярнуцца ніколі.

Ніколі.

Не пачую ўжо клёкату буслаў над страхой, не пачую песьні жнеяў, што вяртаюцца з поля, не пачую чароўнага пяяньня беларускіх жабаў у нашых азярынах і стаўкох...

Ніколі" [7, с. 132-133].

У радках лірычнай споведзі адчуваецца жаданне аўтара зазірнуць у глыбіню ўласнай натуры і разгадаць яе прыродную сутнасць. Ф.Аляхновіч не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вылучае сябе з гістарычнага кантэксту, падкрэслівае сваю падпарадкаванасць жыццёвым абставінам, фатальную залежнасць ад агульнай плыні жыцця, ад сацыяльных дамінантаў. Рэчавы свет, знешнія абставіны сталінскага часу дакладна схоплены пільным вокам мастака. Зразумела, жыццёвы матэрыял заносіўся ў кнігу, якая пісалася ў Вільні пасля вызвалення з сталінскага лагеру, выбарачна, у залежнасці ад псіхалагічнай устаноўкі аўтара, таму значная для ўласнага вопыту падзея часам дамінуе над больш буйной, але нейтральнай для мастака. Такім чынам, можна гаварыць аб важнай іерархіі каштоўнасцей для кожнай асобы, калі дробязі могуць засланяць сабой больш значныя гістарычныя факты. Але ў тым то і заключаецца вартасць аўтабіяграфічнага твора, што ён здольны па-новаму высвяціць добра вядомыя рэчы, убачыць завуаліраванае, здзівіць нечаканым ракурсам бачання з’явы.

Загалоўкі сюжэтаў ("Самарубы"; "Меч рэвалюцыі"; "Перад абліччам сьмерці"; "Вастрожны гумар"; "Лятуценьні й кашмары"; "Голыя ў сьнежні") свядома акцэнтуюць увагу чытача на самым галоўным, самым значным для Аляхновіча, выяўляюць грамадзянскую пазіцыю пісьменніка-гуманіста. Вялікая колькасць фактаў апрацавана аналітычна-назіральным розумам мастака, пра гэта сведчаць сілагічныя выказванні на пачатку многіх міні-здарэнняў. Сілагізмы напоўнены не столькі павучальным сэнсам, колькі адкрытай эмацыянальнасцю, сфарміраванай прамым суб’ектыўным духоўным і жыццёвым вопытам аўтара. ("Як розна трымаюцца людзі перад абліччам сьмерці!" [7, с. 159]; "Памыліўся-б той, хто-б думаў, што за кратамі ўсьцяж чуваць стогны й скрыгатаньне зубоў, што на тварах вязьняў выяўляецца безнадзейная роспач, што ў месцы мукаў ніколі не пачуеш жарту, гумару, бястурботнае песенькі" [7, с. 164].) Лірычна афарбаваныя сілагізмы ўказваюць на здольнасць Ф.Аляхновіча выяўляць прычынна-выніковыя сувязі, даваць эмацыянальна разгорнутую характарыстыку з’яве і паглыбляць філасофскую плынь разважанняў пісьменніка. Усе тэмы-сюжэты прасякнуты аўтарскім бачаннем свету, яго спачувальнымі адносінамі да людзей, асабістым дачыненнем да падзей у высылцы, і такім чынам ствараецца цэласная карціна жыцця ў няволі, выяўляецца невычэрпнасць тэмы, яе экзістэнцыяльны сэнс.

"У кайцюрох ГПУ" — дакументальна-мастацкая аповесць, блізкая па сваёй структуры да дакументальна-мастацкіх запісак "На імперыялістычнай вайне" М.Гарэцкага, калі кожны фрагмент адлюстроўвае канкрэтную часава-прасторавую сітуацыю. Такая кампазіцыя дазваляе пазбягаць строгай паслядоўнасці фактаў, узмацняць тыпізацыю падзей, выдзяляць асабліва важныя пісьменніку здарэнні ў яго лёсе.

Падзеі, факты "лагернага" штодзённага існавання непаўторныя і унікальныя, і ў той жа час універсальна абагульненыя. Пачуццё раздваення асобы ў экстрэмальных умовах нараджала адчуванне, што ўсё, што адбывалася, адбывалася не з ёй. Дзяржаўная рэпрэсіўная машына прызвана была канчаткова зламаць чалавека, па словах польскага пісьменніка А.Вата, "вытравить из человека внутреннюю жизнь, <…> убить внутреннего человека" [8, с. 199]. Але чалавек, як трапна заўважыў Ф.Дастаеўскі, да ўсяго прызвычайваецца. Псіхолагі гэта называюць "феноменам унутранага прыстасавання да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спецыфічнага асяроддзя" (В.Франкл). ("Чалавек ужо прызвычаіўся, што ён нікому не патрэбен, што яго могуць расцерці, як муху, але ўсе ж чапляецца за жыццё, на нешта спадзяецца, верыць, што яго голас нехта пачуе і выратуе з гэтага пекла" [3, с. 10].)

Апынуўшыся ў сітуацыі, калі ўсе маральныя межы адкінуты, чалавек застаўся сам-насам з бязмежнасцю сусветнага хаосу. Ф.Аляхновіч, Б.Мікуліч, А.Ват, С.Грахоўскі, Л.Геніюш паказалі апакаліптычны вобраз свету, у якім пануе стыхія пачварнага вар'яцтва. Лагернае жыццё давала пісьменнікам магчымасць спасцігаць сутнасць быцця і бачыць чалавека на ўзроўні яго першапачатковых псіхалагічных рэакцый, у стане суцэльнага адчужэння: ад прыроды, асяроддзя пражывання, цывілізацыі і нават ад уласнага "я". Адсюль змрочная эмацыянальная дамінанта ў творах, яна выклікана страхам смерці і страхам жыцця адначасова, адзінотай, адчужанасцю, неабароненасцю перад бясконцасцю быцця і ўласнымі душэўнымі прорвамі.

Выратавальным фактарам у такіх нечалавечых умовах існавання выступаў трывалы духоўны кампанент: вера ў Бога, усведамленне сваёй адзінкавасці і унікальнасці, пачуццё ўнутранай годнасці, уласнай каштоўнасці. Духоўны выбар асобы ў экстрэмальных умовах — гэта адзінае, у чым чалавек быў свабодны. Зыход у духоўную сферу даваў шанс лагернаму чалавеку выжыць. В.Франкл у псіхалагічных даследаваннях па праблемах "лагернага" сіндрому чалавека пісаў: "<…> телесно-душевный упадок зависел от духовной установки, но в этой духовной установке человек был свободен! Заключив человека в лагерь, можно было отнять у него все вплоть до очков и ремня, но у него оставалась эта свобода, и она оставалась у него до последнего мгновения, до последнего вздоха. Это была свобода настроиться так или иначе, и это "так или иначе" существовало, и все время были те, которым удавалось подавить в себе возбужденность и апатию. Это были люди, которые шли сквозь бараки и маршировали в строю, и у них находилось для товарища доброе слово и последний кусок хлеба. Они являлись свидетельством того, что никогда нельзя сказать, что сделает лагерь с человеком: превратится ли человек в типичного лагерника или все же даже в таком стесненном положении, в этой экстремальной пограничной ситуации останется человеком" [2, с. 143]. ("<…> С человеческим в человеке нельзя не считаться, <…> все зависит от человека" [2, с. 155].)

Лагернае жыццё ссыльных пісьменнікаў было балансаваннем на мяжы жыцця і смерці, адчаю і надзеі, вар'яцтва і яснасці думкі, адсюль такая аголеная эмацыянальнасць, адкрытасць, пранікнёная спавядальнасць ва ўспамінах. "І мне наканавана было выжыць, — чытаем у С. Грахоўскага, — каб хоць збольшага расказаць пра пакуты маіх "аднабарачнікаў" і "аднабаландпікаў", пра сваю няволю і неадольную прагу жыць, бо не ведаў, якія выпрабаванні яшчэ чакаюць мяне, але каб і прадбачыў, усё адно чапляўся б за жыццё: ніводная ж фантазія не магла ўявіць усяго, што мне давялося перажыць, пабачыць на сваім вяку і стаць сведкам, калі праўда стала Праўдаю. Дзеля гэтага трэба было жыць" [3, с. 133]. Б.Мікуліч у "Аповесці для сябе" пісаў: "<…> со мною ходит рядом красивая моя мечта, которая поддерживала меня и в ветреной новосибирской

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

степи, и в морозы Красноярска, и в грязи этапов, и в угольной пыли "пятьсот веселого"…" [9, с.467].

Мы можам гаварыць пра прысутнасць у дзённікавай прозе прыгаданых аўтараў трывалай экзістэнцыяльнай свядомасці, якая прыватнае пісьменніцкае жыццё пераводзіць у разрад жыцця мільёнаў ахвяр сталінскага рэжыму. Невыпадкова ключавым словам "лагернай" прозы становіцца паняцце "жыццё" ("Жыцьцё нашае было працай, болем, але было й песьняй, якой не было ў другіх народаў; <…> Пялі — знача жылі!" [4, с. 137]; "Яму сьнілася Бацькаўшчына, а мне свабода й жыццё" [4, с. 129]; "Жыццё раздвойвалася на горкую і страшную праўду і на ружовую хлусню" [3, с. 195]; "Жыццё — капейка" [3, с. 94]; "Найстрашнэйшае, найбольш жудаснае жыцьцё мае шчэ свае прывабнасьці. Найгоршае жыцьцё — лепш за смерць. Бо тут заўсёды ёсьць яшчэ нейкая надзея, а там — надзеі ўжо няма" [7, с. 164].)

Ключавое слова "жыццё" набывае канцэптаўтваральны сэнс: жыццё як бясконцая перспектыва і жыццё як прыватны лёс. Гэтыя паняцці ўвесь час ідуць побач, перакрыжоўваюцца, зліваюцца. Суб'ектыўны ракурс бачання сябе і свету падаецца аўтарамі эмацыянальна ўзрушана, хутчэй нават напружана, бо ўспаміны пісаліся значна пазней, і пісьменнікі імкнуліся ажывіць памяць, адчуць перажытае, скрупулёзна фіксуючы душэўныя пералівы. Польскаму пісьменніку-вязню А.Вату, напрыклад, адчуванне шчасця ў львоўскай турме надаваў пах лугу і сена з узгоркаў, што знаходзіліся побач. "Недалеко от тюрьмы начинались холмы, и летом доносился запах луга и сена. Путь из смердящей уборной в смердящую камеру, прогулка медленным шагом вдоль распахнутых во двор окон — представь себе, это и было счастье. И не только счастье, а катарсис, внутреннее очищение, духовное и физическое. Оно продолжалось какую-нибудь минуту, но в другом, психическом измерении длилось гораздо дольше. Таковы мои самые дорогие воспоминания, и я в самом деле часто ловил себя на мысли: "Ах, еще бы раз это пережить!" [8, с. 208]. Эмацыянальная ўспышка яркага пачуцця аказалася здольнай на нейкі момант засланіць нават небяспеку лагернага побыту.

Прыродная гарманічная цэласнасць асобы ў нечалавечых лагерных умовах парушалася адчуваннем няспраўджанай самарэалізацыі, перарваных сувязяў з роднымі, пачуццём адарванасці ад агульнай плыні жыцця, незапатрабаванасці часам. Дзённік Б.Мікуліча "Аповесць для сябе" выяўляе высокі маральны і нерэалізаваны грамадзянскі патэнцыял аўтара. У творчасці, у асабістай адказнасці за друкаванае слова, якое сцвярджала б ідэалы дабрыні, спагады, міласэрнасці, бачыў сваё прызванне беларускі пісьменнік. У асобных кароткіх запісах Б.Мікуліча прысутнічае яго суаднесенасць з вялікім цэлым, і дзякуючы гэтай суаднесенасці занатоўкі вызначаюцца здзіўляючай змястоўнасцю і напоўнены глабальнымі быційнымі сэнсамі.

У "Аповесці для сябе" ёсць структурныя элементы прытчы, байкі, легенды, сну, літаратурнага партрэта. Жанр споведзі і асабліва дзённік і дзённікавая проза XX ст. могуць мець так званыя "жанравыя вокны", якія даюць магчымасць "выхаду ў іншы свет" (А.Ягораў). Гэта можа быць хроніка закуліснага літаратурнага жыцця, побытавы дзённік, нарыс-партрэт вядомай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асобы, замалёўка нейкага свята. Афармленне аўтабіяграфічнага матэрыялу ў выглядзе аўтаномнай сэнсавай адзінкі дае права гаварыць не толькі аб "адчуванні жанру" Ф.Аляхновічам, Л.Геніюш, Б.Мікулічам, але і пра фарміраванне жанравага мыслення з адпаведнымі структурнымі катэгорыямі і дыферэнцыраванымі элементамі зместу, здольнымі надаваць твору мастацкую выразнасць.

Галоўная задача пісьменніка гулагаўскай няволі — не толькі выжыць, але і не згубіць самога сябе, захаваць сваю самасць, уласнае бачанне свету. Пісьменніцкае "я" выяўляе сваю адметнасць і ў дачыненні да прыгожага пісьменства наогул, уласных твораў у прыватнасці. Так, Л.Геніюш вельмі цешыла тое, што яе вершы ўспрымаліся вязнямі як выратавальная "глюкоза". Высокія патрабаванні да тагачаснай польскай літаратуры выказве А.Ват у львоўскай турме адразу пасля арышту: "Литература не соответствовала нашей экзистенциальной ситуации, не дотягивала до неё <…>. Она годилась только для баб и детей, а не для взрослых мужчин" [8, с. 209]. Але нават пры такіх звышпатрабаваннях "чтение на Лубянке стало одним из главных впечатлений моей жизни. Книги не просто помогли мне отвлечься — они преобразили меня, сформировали заново. Я стал иначе понимать не только литературу, но и вообще все. Литература — попытка некоего постижения и синтеза, и, значит, поэзия, в конце концов — героизм. Я — нагой, голый, слабый, дрожащий пещерный человек, беззащитный перед лицом стихий, демонов и диких зверей, а поэт совершает подвиг утешения — подвиг в подлинном смысле слова. Мне стало тогда ясно, что в этом суть литературы, ее оправдание в мире. Утешение другого такого же, лишенного всего, слабого пещерного человека" [8, с. 219]. "Чтение возвращало нас к жизни, погружало в круг забот нормальных, свободных людей, живущих в широком мире. "<…> Я, например, волю к жизни и, даже более того, ницшеанское amor fati (любоў да лёсу (лац.). Пераклад наш. — *Т.Т.*) находил в каждом, даже самом пессимистическом произведении. Чем пессимистичнее оно было, тем сильнее я ощущал в нем скрытую пульсацию энергии, витальной силы" [8, с. 221].

Дзённік Б.Мікуліча таксама інфармуе чытача аб мастацкіх густах пісьменніка, яго ўяўленнях пра мастацкі метад, стыль, эстэтыку, уражанні аб прачытаных кнігах, калегах-пісьменніках. Запісы Б.Мікуліча стылёва неаднародныя: мы сустракаем у накідах некалькі моўных пластоў — штодзённыя запісы, занатоўкі-разважанні як вынік жыццёвых назіранняў і мастацкія накіды — задумкі да будучых твораў. Шматслойная стылёвая структура надае дзённіку Мікуліча дынаміку і выразнасць, гаворыць пра багацце творчай натуры пісьменніка, які быў пазбаўлены магчымасцей самарэалізавацца. Выбарачны характар запісаў сведчыць аб рацыянальна-псіхалагічнай устаноўцы аўтара, яго намерах фіксаваць толькі тыя падзеі, што знаходзяць душэўны водгук, адпавядаюць маральна-псіхалагічным нормам мастака. Маральна-інтэлектуальная сфера разважанняў дамінуе ў дзённіку над дэталямі бытавой неўладкаванасці, сацыяльнымі праблемамі.

Надзвычай важнай катэгорыяй у выяўленні экзістэнцыяльнай праблематыкі аўтабіяграфічнай прозы з’яўляецца катэгорыя часу. Часавая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

арганізацыя аўтабіяграфічнага твора — істотны для нас момант, бо час падзей, пра якія ідзе гаворка ў тэксце, не супадае з часам аповяду пра іх. Часавая дыстанцыя, адлегласць можа вельмі істотна ўплываць на аўтарскую пазіцыю, ацэнку, на ўспрыманне жыцця наогул. У аўтабіяграфічнай прозе той, хто апісвае, і каго ён апісвае, супадаюць у адной асобе, такім чынам адбываецца "спалучэнне розных часавых планаў" [6, с.120]. Д.Ліхачоў, аналізуючы "Жыціе пратапопа Авакума", пісаў: "Аввакум как бы смотрит на свое житие из определенной точки настоящего, и эта точка зрения крайне важна в его повествовании. Она определяет то, что можно было бы назвать временной перспективой, делает его произведение не просто повествованием о своей жизни, а повествованием, осмысляющим его положение в тот момент, когда он писал его… (падкрэслена намі. — *Т.Т.*)" [10, с. 305]. Менавіта гэты заўважаны ракурс вельмі важны для нас. Даследчык Н.Ніколіна называе яго "ўплывам дзвюх велічынь: часу, пра які пішам, і часу, у якім пішам" (падкрэслена Н.Ніколінай. — *Т.Т.*) [11, с. 276]. Такім чынам, аўтабіяграфія як адметная жанравая форма, з аднаго боку, скіравана "во внутренний мир автора, а с другой — к его прошлому, которое с той или иной мерой последовательности сопоставляется с его настоящим..." [11, с. 275-276].

Суб'ектыўнае ўспрыманне часу ў аўтабіяграфічным творы цягне за сабой то яго доўжанне, запаволенасць, то паскарэнне. У прозе, пабудаванай як успаміны аб мінулым, назіраецца "часавае раздваенне" (Н.Ніколіна). Уласна біяграфічны час спалучаецца з гістарычным па-рознаму. У сучасных беларускіх творах з "лагернай" тэматыкай асноўная ўвага надаецца біяграфічнаму часу, цесна спалучанаму з гістарычным часам, які ўплывае на чалавека, што выпадкова апынуўся на шляху гісторыі. Гістарычны час можа выходзіць на першы план у тым выпадку, калі для аўтара больш важным аказваецца намер высветліць змену светапоглядных канцэпцый эпохі, сутыкненне ідэй, поглядаў. Апісанне біяграфічнага часу носіць дыскрэтны характар у тым выпадку, калі мы маем спалучэнне элементаў аўтабіяграфіі і мемуараў (Ф.Аляхновіч "У капцюрох ГПУ"). У споведзях, дзённіках (Л.Геніюш, Б.Мікуліч, А.Ват, С.Грахоўскі) пераважае ўласна біяграфічны час ("бытавы час" Ніколіна), але дамінуючая роля ўласна прыватных успамінаў пісьменніка, надзвычай адчувальнага да навакольнага свету, не памяншае ступень еднасці асобы са сваім часам, а, наадварот, актуалізуе мінулае, павялічвае ступень даверу з боку чытача.

Вядомы псіхолаг Віктар Франкл, які доўгі час займаўся пытаннямі экзістэнцыяльных праблем чалавека ў канцэнтрацыйным лагеры, звярнуў увагу на адну з самых важных праблем чалавечай псіхікі: на ўспрыманне часу вязнямі. "Принимая во внимание преимущественно временной характер, присущий человеческому существованию, более чем понятно то, что жизни в лагере сопутствовала потеря уклада всего существования. <…> С утратой человеком "своего будущего" утрачивает всю свою структуру его внутренний временной план, переживание им времени. <…> В тот момент, когда человек не в состоянии предвидеть конец временного состояния в его жизни, он не в состоянии и ставить перед собой какие-либо цели, задачи. Жизнь неизбежно

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

теряет в его глазах всякое содержание и смысл. Напротив, вúдение "конца" и нацеленность на какой-то момент в будущем (падкрэслена намі. — *Т.Т.*) образуют ту духовную опору, которая так нужна заключенным, поскольку только эта духовная опора в состоянии защитить человека от разрушительного действия сил социального окружения, изменяющих характер, удержать его от падения" [2, с.141-142].

У дзённікавых творах Ф.Аляхновіча, Б.Мікуліча, Л.Геніюш, С.Грахоўскага, А.Вата ёсць вострае адчуванне часу, які незваротна мінаецца, і гэта надае творам песімістычны тон. У нацыянальнай аўтабіяграфічнай прозе прысутнічае таксама моцны мемуарны кампанент з ярка выяўленым сацыяльным планам, падзеі знешняга жыцця па законах асацыятыўнай сувязі цесна пераплецены з прыватнымі фактамі. Самастойныя мемуарныя фрагменты пашыраюць сэнсавае поле дзённікавай прозы, яе інфармацыйную базу, на іх фоне ўласнае пісьменніцкае жыццё пры высокім філасофскім узроўні асэнсавання набывае рысы універсальнага абагульнення, тыпізуецца і ўспрымаецца істотным эпізодам у ланцугу жыццёвых калізій чалавецтва.

Аўтар як арганізуючы пачатак не губляецца за вялікай колькасцю фактаў грамадскага жыцця (у гэтым плане інфармацыйная каштоўнасць дзённіка выключная!), бо яны ўпарадкаваны лагічнай думкай пісьменніка, яго арыгінальнай стылёвай арганізацыяй. Шляхі стылёвага ўвасаблення часу могуць быць самымі рознымі: плынь часу — плынь свядомасці, час як сусветная фантасмагорыя, час як суаднесенасць імгнення і вечнасці, час як эфект сціснутых стагоддзяў, дзесяцігоддзяў, тыдняў... які выяўляецца праз сімультанную кампазіцыю, і шэраг іншых прыёмаў. "Лагерная" проза далікатна спалучыла імгненне і вечнасць, цану чалавечага жыцця і каштоўнасць імгнення.

Для ўсёй беларускай аўтабіяграфічнай прозы характэрна згарманізаванасць гісторыі прыватнага жыцця пісьменніка з сацыяльнай сферай, з вялікай гісторыяй. Фактычна, так было заўсёды, што істотна адрознівае нацыянальную літаратуру ад заходнееўрапейскай. Л.Геніюш, С.Грахоўскі час перажываюць узрушана эмацыянальна, у іх творах адчуваецца завершанасць года зямнога існавання і — незваротнасць часу. Катэгорыя часу ў аўтабіяграфічных творах Л.Геніюш, С.Грахоўскага, А.Вата (творы пісаліся напрыканцы жыцця) наогул мае песімістычную афарбоўку, выкліканую псіхалагічным надломам, няспраўджанымі надзеямі, жыццёвай стомленасцю, абвостраным адчуваннем хуткаплыннасці жыцця, калі трэба даражыць кожнай хвілінай. Вобраз часу ў экзістэнцыяльнай стылістыцы ёсць адзіная катэгорыя вымярэння, здольная захаваць у памяці гісторыі альбо адправіць у нябыт, вынесці свой адзінкава правільны прысуд чалавеку, яго нашчадкам. Таму так часта С.Грахоўскі, Л.Геніюш, Б.Мікуліч, А.Ват спасылаюцца на Час-Суддзю, вядуць з ім свой няспынны дыялог, шукаючы спачування, паратунку і абароны. "Замільгалі назвы беларускіх станцый. Ад хвалявання хадзіў і хадзіў па праходзе вагона — думаў, строіў планы то светлыя, то змрочныя. Але колькі ні плануй, жыццё ўсё вырашае па-свойму і нечакана выносіць зусім на іншы бераг.

Вынесла яно і мяне ў свет, пра які я і не адважваўся марыць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Я пражыў доўгае, складанае, пакутнае і цікавае жыццё, аж не верыцца, што ўсё перажытае было са мною. А было, і нічога забыць нельга. Я дзяліў горкую долю свайго народа і шчаслівы, што цяпер магу паспавядацца за сябе і сваіх незваротных сяброў" [3, с.356].

Такім чынам, каштоўнасць "лагернай" аўтабіяграфічнай прозы — у грунтоўным даследаванні быцця паміж жыццём і смерцю, працэсаў дэфармавання свядомасці чалавека ў замкнёнай прасторы, што выклікае страту цэласнасці асобы. Пісьменніцкі талент аўтараў-вязняў аказаўся здольным ператварыць прыватныя аўтабіяграфічныя факты ў мастацка абагульнены вобраз эпохі, выявіць логіку жыцця ў нечалавечых умовах, актуалізаваць анталагічныя праблемы быцця ў сітуацыі парога, мяжы, агаліць сутнасныя экзістэнцыяльныя сэнсы. Паглыблены аналіз духоўнай сферы ўласнага "я" ў нечалавечых лагерных абставінах каштоўны найперш тонкімі назіраннямі за пакутлівымі зрухамі душы ў пошуках ісціны ва ўмовах нестабільнай, хуткаплыннай знешняй рэчаіснасці.

Сітуацыя лагера стварала ўмовы, каб у чалавеку канчаткова перамог жывёльны інстынкт, а значыць — было страчана адчуванне межаў, у тым ліку самай галоўнай мяжы — сумлення, якое давала сілы супрацьстаяць, рэалізоўваць уласную свабоду быць адказным. Выхад пісьменнікаў-вязняў да экзістэнцыяльнай свядомасці (адзін з самых устойлівых кампанентаў самасвядомасці чалавека ў свеце) вызначыў не толькі маштаб і характар усіх змен у чалавеку, але і прынцыпы адбору матэрыялу: не згубіць адценняў, дробных фактаў, нават неістотных, і галоўнае, прывесці іх у сістэму, апісваць, "як я бачу гэты стол, вуліцу, людзей, мой кісет, таму што менавіта яны і змяніліся" (Сартр). Сфармуляваны Сартрам экзістэнцыяльны ракурс бачання свету і сябе ў свеце аказаўся надзвычай плённым для "лагернай" прозы, вытрыманай у межах рэалістычнай традыцыі. Толькі калі рэалістычнае светабачанне імкнецца адлюстраваць галоўнае, істотнае, то мэта экзістэнцыяльнай свядомасці —"правда: неизбирательная, вне иерархических систем, воспринятая на эмпирическом уровне, без изначальных этических концепций и критериев; правда жестокая, обнаженная, хлесткая"[1, с. 31].

Прысутнасць экзістэнцыяльнай свядомасці ў рэалістычных творах Ф.Аляхновіча, Б.Мікуліча, Л.Геніюш, С.Грахоўскага, А.Вата дапамагае раскрыць у чалавеку загадкавае, таямнічае, глыбіннае, што пры толькі рэалістычным падыходзе магло застацца па-за кадрам. "Лагерная" проза сведчыць аб невычэрпных магчымасцях рэалізму, які ў спалучэнні з экзістэнцыяльным кампанентам адкрыўся чытачу новымі гранямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЛІТАРАТУРА


1. З а м а н с к а я, В. В. Экзистенциальная традиция в русской литературе XX века. Диалоги на границах столетий / В.В.Заманская. — М.: Флинта: Наука, 2002. — 304 с.
2. Ф р а н к л, В. Человек в поисках смысла: Сборник / В.Франкл. — М.: Прогресс, 1990. — 368 с.
3. Г р а х о ў с к і, С. Выбраныя творы: у 2 т. / С.Грахоўскі. — Т.2. Крыжавы шлях: Аповесці. Апавяданні. — Мінск: Маст. літ. 1994. — 448 с.
4. Г е н і ю ш, Л. Споведзь / Л.Геніюш; падрыхт. тэксту, прадм., камент. М.М.Чарняўскага. — Мінск: Маст. літ., 1993.— 271 с.
5. Б л о к, А. Сочинения: в 2 т. / А.Блок. — Т. 2. — М.: ГИХЛ, 1955. — 846 с.
6. У с п е н с к и й, Б. Поэтика композиции / Б.Успенский. — СПб.: Азбука, 2000. — 352 с.
7. А л я х н о в і ч, Ф. У капцюрох ГПУ: Аповесць / Ф.Аляхновіч. — Мінск: Маст. літ., 1994.— 238 с.
8. В а т, А. Мой век. Устные мемуары. (Фрагменты книги) / А.Ват. — Пер. с польск. Н.Каменевой. Предисл. Ч.Милоша // Иностранная литература. 2006. №5. — С.173-245.
9. М і к у л і ч, Б. Аповесць для сябе / Б.Мікуліч // Чорны К. Зямля: Раман / К.Чорны. Аповесць для сябе: Для сярэд. і ст. шк. ўзросту / Б.Мікуліч; Да зб. ў цэлым: Пад рэд. Л.В.Календа; Маст. Т.П.Парэчына. — Мінск: БелЭН, 1998. — С. 268 — 493.
10. Л и х а ч е в, Д. С. Поэтика древнерусской литературы / Д.С.Лихачев. — Л.: Наука, 1967. — 372 с.
11. Н и к о л и н а, Н. А. Поэтика русской автобиографической прозы: Учеб. пособие / Н.А.Николина. — М.: Флинта: Наука, 2002. — 424 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*УДК 82 — 3*

Т а р а с о в а Т. Н. Экзистенциальная реальность ГУЛАГа в дневниковой прозе // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2008. № 4. С.

Рассматриваются произведения белорусских авторов Ф.Алехновича "В когтях ГПУ", Л.Гениюш "Исповедь", С.Граховского "Зона молчания", "С волчьим билетом", "Такие синие снега", Б.Микулича "Повесть для себя", А.Вата "Мой век. Устные мемуары". ГУЛАГовская тематика автобиографической прозы привнесла в литературу новые аспекты исследования проблем человека: бытие между жизнью и смертью, деформированное сознание индивида в замкнутом пространстве, утерянная целостность личности и ее нереализованный идеал. Лагерный жизненный опыт писателей давал им возможность постигать сущность бытия и видеть человека на уровне его первоначальных психических реакций, в состоянии полного отчуждения: от природы, среды выживания, цывилизации и даже от собственного "я".

Библиогр. — 11 назв.

T.Tarasava

The existential reality of the GULAG in the diary prose

Summary

The article deals with the works by Belarus writers, particularly, “In the GPU claws” by F.Alekhnovitch, “Confession“ by L.Gueniush, “The area of the silence”, “ With the Wolf Card” and “Such Blue Snows” by S.Grakhovski, “The Novel for Myself” by B.Mikoulitch and “My Century. Oral Memoirs” by A.Vat. The subject of the GULAG in the autobiographical prose has brought in the literature new aspects of investigation of problems of a Human being: existence between the life and the death, distorted consciousness of an individual in closed expense, lost integrity of the personality and his unrealized ideal. Personal life experience in camps gave the authors the opportunity to conceive the essence of the existence et to see a human being on the level of his primary psychical reactions in the state of complete alienation from the nature, milieu of survival, civilization and even his own “Self”.

РЭФЕРАТ

У артыкуле Тарасавай Т.М. "Экзістэнцыяльная рэчаіснасць ГУЛАГа ў дзённікавай прозе" разглядаюцца творы беларускіх аўтараў Ф.Аляхновіча "У капцюрох ГПУ", Л.Геніюш "Споведзь", С.Грахоўскага "Зона маўчання", "З воўчым білетам", "Такія сінія снягі", Б.Мікуліча "Аповесць для сябе" і польскага пісьменніка А.Вата "Мой век. Вусныя мемуары".

Гулагаўская тэматыка аўтабіяграфічнай прозы прыўнесла ў літаратуру новыя аспекты даследавання праблем чалавека: быццё паміж жыццём і смерцю, дэфармаваная свядомасць індывідума ў замкнёнай прасторы, страчаная цэласнасць асобы і яе нерэалізаваны ідэал. Лагерны жыццёвы вопыт пісьменнікаў даваў ім магчымасць спасцігаць сутнасць быцця і бачыць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавека на ўзроўні яго першапачатковых псіхалагічных рэакцый, у стане суцэльнага адчужэння: ад прыроды, асяроддзя пражывання, цывілізацыі і нават ад уласнага "я".

Важным аспектам даследавання аўтабіяграфічнай прозы стаў духоўны выбар асобы ў экстрэмальных умовах. Зыход у духоўную сферу даваў шанс лагернаму чалавеку выжыць. Ключавое слова "жыццё" набывае ў творах Ф.Аляхновіча, Л.Геніюш, Б.Мікуліча, С.Грахоўскага, А.Вата канцэптаўтваральны сэнс: жыццё як бясконцая перспектыва і жыццё як прыватны лёс. Дзённікавыя запісы выяўляюць суаднесенасць мастакоў з вялікім цэлым, і, дзякуючы гэтай суаднесенасці, занатоўкі вызначаюцца здзіўляючай змястоўнасцю і напоўнены глабальнымі быційнымі сэнсамі.

Надзвычай змястоўнай катэгорыяй у выяўленні экзістэнцыяльнай праблемтыкі аўтабіяграфічнай прозы стала катэгорыя часу. Вобраз часу — адзіная катэгорыя вымярэння маральных каштоўнасцей. У беларускіх аўтараў розная суаднесенасць уласна біяграфічнага часу з гістарычным. Для нацыянальнай аўтабіяграфічнай прозы ўласціва цеснае спалучэнне гісторыі прыватнага жыцця пісьменніка з сацыяльнай сферай, з вялікай гісторыяй, што істотна адрознівае айчынную літаратуру ад заходнееўрапейскай.

Шляхі стылёвага ўвасаблення часу ў "лагернай" прозе самыя розныя: плынь часу — плынь свядомасці, час як сусветная фантасмагорыя, час як суаднесенасць імгнення і вечнасці, час як эфект сціснутых стагоддзяў, дзесяцігоддзяў, тыдняў... Праз сімультанную кампазіцыю, фрагментарнасць "лагерная" проза спалучыла імгненне і вечнасць, цану чалавечага жыцця і каштоўнасць імгнення.

Пісьменніцкі талент Ф.Аляхновіча, Б.Мікуліча, Л.Геніюш, С.Грахоўскага, А.Вата, рэалізаваны ў межах рэалістычнай традыцыі, аказаўся здольнымператварыць прыватныя аўтабіяграфічныя факты ў мастацка абагулены вобраз эпохі, выявіць логіку жыцця ў нечалавечых умовах, актуалізаваць анталагічныя праблемы быцця ў сітуацыі парога, мяжы, агаліць сутнасныя экзістэнцыяльныя сэнсы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ